**Урок беларускай мовы ў 8 класе**
**Безасабовыя сказы: будова, значэнне, ужыванне**

**Л. Б. Сялецкая,**
настаўніца беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
Лойкаўскай СШ Гродзенскага раёна

**Мэты:**

- спрыяць асэнсаванню вучнямі паняцця *безасабовы сказ*, паказаць сэнсава-стылістычную ролю такіх сказаў у маўленні;
- выпрацоўваць уменні пазнаваць безасабовыя сказы ў тэкстах, даваць ім граматычную характарыстыку, праводзіць сінанімічную замену двухсастаўных і безасабовых сказаў, параўноўваць іх сэнсавае значэнне, ужываць такія сказы з пэўнымі камунікатыўнымі мэтамі ва ўласным маўленні;
- навучыць адрозніваць безасабовыя сказы ад пэўна-, няпэўна- і абагульнена-асабовых;
- спрыяць выхаванню дабрыні, спагадлівасці ў адносінах да блізкіх, да ўсяго, што акаляе чалавека.

**Тып:** урок засваення новых ведаў.

**Формы правядзення**: індывідуальная, групавая работа, работа ў парах, тэст.

**Абсталяванне:** карткі-заданні, запісы на дошцы, тэставае заданне, Бадзевіч З.І. Беларуская мова: вучэбны дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус.мовамі навучання / З.І. Бадзевіч, І.М. Саматыя. – Мінск: Нац.ін-т адукацыі, 2009.

**Эпіграф:**

Усё праходзіць, быццам дождж няроўны, –
І боль, і злосць, і дробная брыда,
А застаецца самы важны і галоўны,
І самы светлы талент – дабрата. (С. Грахоўскі)

## Ход урока

### І. Стварэнне эмацыянальнага настрою

<u>*Настаўнік*</u>. Звернемся да эпіграфа:

- ✓ Прачытайце эпіграф, вызначце асноўную думку.
- ✓ Чаму аўтар называе дабрыню талентам?
- ✓ Ці ўсе людзі валодаюць талентам дабрыні?
- ✓ Як можна выхаваць у сябе гэтую якасць характару, якое яна мае значэнне? Падбярыце сінонімы да слова *дабрыня.*

Жадаю вам дабра і плённай працы на ўроку.

### ІІ. Арганізацыйны момант

### ІІІ. Праверка дамашняга задання

<u>*Прыём “Дапоўні адказ”:*</u>

✓ Сказы, граматычная аснова якіх складаецца з аднаго галоўнага члена, называюцца… (*аднасастаўнымі*), прывядзіце прыклад (*Спакойна іду па мурожнай траве).*
✓ Да аднасастаўных сказаў з галоўным членам выказнікам адносяцца…
✓ Пэўна-асабовымі сказамі называюцца…
✓ Няпэўна-асабовымі сказамі называюцца…
✓ Абагульнена-асабовымі называюцца…
✓ Сказ – гэта…

**IV. Арфаграфічная хвілінка**

1. Устаўце прапушчаныя літары (картка-заданне для кожнага вучня).

П..ліклініка, п..ўдзень, кра..від, м..тацыкл, ст..тысячны, бе..памылковы, восен..скі, , а..дыторыя, л..генда, спад..лба, аб..лгаць, карэн..чык, па..казка, ра..збраенне, пад..езд, с..кунда, аблас..ны, ноч..у, палес..кі, л..ю, Іл..я, шасц..ю, міл..ён, мен..ш, кал..ндар, здароў..е, поч..рк.

*(Адказы запісаны на адвароце дошкі, вучні працуюць у парах, праводзяць узаемаправерку напісаных слоў)*

2. Сінтаксічны разбор сказа (сказ запісаны на дошцы)

***Многа было сказана добрых слоў*.**

Пытанні класу - *чым выражаны галоўны член сказа? Да якога віду аднасастаўных сказаў можам аднесці гэты сказ?*

*(Вучні працуюць на месцах, адзін вучань выконвае заданне на дошцы).*

**V. Паведамленне тэмы і вызначэнне мэты ўрока**

✓ Знаёмства з тэарэтычным матэрыялам вучэбнага дапаможніка. С. 121.
✓ Практ. 165. Разгледзьце табліцу. Назавіце спосабы выражэння выказніка ў безасабовым сказе, выкарыстоўваючы ўласныя прыклады або прыклады з практ. 168.

**VI. Фізкультхвілінка**

Практыкаванні:
✓ намалюйце вачамі лічбы 0,8;
✓ намалюйце вачамі лічбы ад 1 да 9 ад падлогі да столі;
✓ заплюшчыце вочы, уявіце рамонкавае поле;
✓ пацягніцеся рукой (правай, левай) уверх, каб дастаць галінку бэзу.

**VII. Замацаванне і сістэматызацыя ведаў**

✓ Выкананне практ. 166 (с.123, па 2 сказы ). Работа ў парах.

*Настаўнік.* Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце галоўны член безасабовых сказаў. Укажыце, чым ён выражаны.

***Адказы.***

1) Не быць (інф.) Радзіме безыменнай, зямлі бацькоў не анямець (інф.).
2) Вечарэе (безас. дзеясл.).Дзень даўно павесіў на сасне сваю касу зары.
3) Світала (безас. дзеясл.). Пад ботамі скрыпеў марозны снег.
4) Цямнее ў лесе (ас. дзеясл.) Ноч надыходзіць, марозік злёгку націскае.

5) Вакол было ціха (ас. дзеясл.+ прэдыкат. прысл.). На небе свяціліся зоркі.

6) Марозна (прэдыкат. прысл.). Хмурнавата (прэдыкат. прысл.). Сняжок падкідвае заўзята.

**VIII. Самастойная творчасць вучняў.**

<u>*Праца ў групах*</u>

***Заданне 1 групе. У дадзеных складаных сказах замяніце безасабовыя сказы двухсастаўнымі:***

1. Яго здароўе было моцна падарвана, і пакуль (ЯМУ) прыходзілася лячыцца.
2. Сонца ўжо стаяла нізка над гарызонтам, і (МНЕ, НАМ, ЯМУ…) трэба было спяшацца.
3. Бацька скажа адно слова, і ўсё будзе зроблена (ён усё зробіць…).
4. Хутка настане восень, і мне трэба ехаць у горад (я паеду ў горад).
5. Стала цёмна, і вуліца зусім апусцела.

***Заданне 2 групе. Просты сказ замяніце складаным са злучнікам <u>і</u> так, каб адна з частак стала безасабовым сказам:***

*Узор. Я заплакала і адчула палёгку. – Я заплакала, і мне стала лягчэй.*

1. Я хацеў выканаць практыкаванне і сказаў аб гэтым настаўніку. – Хацелася выканаць практыкаванне, і я сказаў аб гэтым настаўніку.
2. Дзіцё было хворае і хацела спаць. – Дзіцё было хворае, і яму хацелася спаць.
3. Праехаць тут ён не змог і павярнуў назад. – Праехаць тут ён не змог, і яму прыйшлося павярнуць.

***Заданне 3 групе. Складзіце безасабовыя сказы з наступнымі дзеясловамі ў форме цяперашняга і прошлага часу:***

Змяркацца. Цямнець. Вечарэць. Падмарозіць. Нездаровіцца.

**IX. Абагульненне і сістэматызацыя ведаў**

<u>*Індывідуальнае заданне*</u>

Сказы запісаны на дошцы, выклікаецца адзін вучань. Астатнія запісваюць сказы ў свае сшыткі.

Устанавіце адпаведнасць паміж аднасастаўнымі сказамі і іх відамі. Праверце напісанае.

1) Ад сухой папараці патыхае сухім дрэвам. (І. Пташнікаў)
2) Па рэчцы ўгадвалі і надвор’е… (В. Адамчык)
3) Пахмурны ранак. Самотны парк. (Я. Брыль)
4) Хто пытае, той не блудзіць. (Прыказка)

| | |
|---|---|
| А. Назыўны | Г.Абагульнена - асабовы |
| Б.Няпэўна-асабовы | Д. Безасабовы |
| В. Пэўна-асабовы | |

Адказы: 1 Д, 2 Б, 3 А, Г 4.

**X. Тэставае заданне (5 хвілін)**

**1. Адзначце спосабы выражэння выказніка ў безасабовым сказе**

1) інфінітыў;
2) безасабовы дзеяслоў;
3) дзеяслоў 2-й асобы абвеснага і загаднага ладу;
4) прыслоўе са значэннем стану;
5) дзеяслоў 3-й асобы множнага ліку.

**2. Адзначце безасабовыя сказы:**

1) Усё навокал пасвятлела, праяснілася. (В. Вольскі)
2) Пахне сасной, зямлёй і мокрай ігліцай. (І. Пташнікаў)
3) Ад фільтраў патыхала гарачынёй… (А. Савіцкі)
4) Свет адразу зрабіўся святлейшы. (І. Грамовіч)
5) Не спалася мне ў той летні адвячорак. (Х. Лялько).

Адказы. **1** – 1),2),4). **2 -** 2), 3),5).

**XI. Падвядзенне вынікаў урока, выстаўленне адзнак.**

**XII. Дамашняе заданне. П. 31,** 1. Практ. 168. 2. Напішыце міні-сачыненне на тэму “Самы светлы талент – дабрата”. (З ужываннем безасабовых сказаў).